4) усе выпадкі, калі У. Караткевіч выкарыстоўвае персаніфікацыю, накіраваны на разуменне чытача цеснай сувязі чалавека і навакольля, нерухомасці гэтай сувязі.

## ЛІТАРАТУРА

1. Караткевіч, У. Зямля пад белымі крыламі / У. Караткевіч. - Мінск. : "Народная асвета", 1992. – 191 с.

УДК 821.161.3:398.332.2

Вуч. Д.А. Мекта
Навук. кір. Н.А. Жураўлевіч, настаўнік беларускай мовы і літаратуры
(ДУА "Сярэдняя школа № 1 г. Светлагорска")

# КУПАЛЛЕ Ў БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

У апошні час і прэса, і народ праяўляюць павышаную цікавасць да фальклору, народных звычаяў і абрадаў, да паходжання рэлігійных вераванняў.

У беларускай вуснай народнай паэзіі група купальскіх святаў з'яўляецца адной з самых багатых па архаічных матывах, па сімволіцы, па разнастайнасці мелодыкі, таму прадметам маёй працы стала **Купалле.**

Купалле вядома ўсім народам Еўропы.

Перад Купаллем дзяўчаты і жанчыны ішлі збіраць васількі, купалінку, папараць і спявалі песні.

Адным з першых, хто звярнуўся ў сваіх творах да абраду Купалля быў Францішак Багушэвіч. У вершаваным апавяданні "Хцівец і скарб на святога Яна" ён пераклаў шырока распаўсюджаныя ў народзе легенды і быліны пра пошук скарбу ў купальскую ноч з дапамогай кветкі-папараці. Па сюжэце верш Ф.Багушэвіча ў многім нагадвае вядомае апавяданне М.Гогаля "Вечар напярэданні Івана Купалы". У аснове абодвух твораў – і страх людскі перад лясным гушчаром з яго насельнікамі ( злымі духамі), і глыбока старажытная вера ў чароўнасць купальскай ночы, і надзея здабыць шчасце з дапамогай кветкі незвычайнай расліны.

Матыў папараці-кветкі як сімвал свабоды, шчасця, духоўнага багацця, валодання таямніцамі прыроды становіцца ад гэтага часу асноўным , скразным у беларускай літаратуры, асабліва ў пачатку XX стагоддзя.

У алегарычнай казцы "Купальскія светлячкі" Якуб Колас праводзіць тую ж патаемную, важнейшую думку, што і Ф. Багушэвіч.

Праўда, у мудрага Коласа не звычайны чалавек, а казачны знаходзіць папараць-кветку.

Блізкім да верша Ф.Багушэвіча па сюжэце, але зусім адметным па стылі з'яўляўся фантастычны абразок Канстанцыі Буйло "Кветка папараці.Невялічкі драматычны абразок паэтэсы прасякнуты аптымізмам і верай у шчаслівую для беларускага народу будучыню.

Ніхто з беларускіх пісьменнікаў так не звязаны з купальскім святам, як Янка Купала.

Іван Дамінікавіч Луцэвіч нарадзіўся на Янаў дзень і ўбачыў у гэтым нейкі знак лёсу. Неаднаразова выкарыстаў ён купальскія матывы ў сваёй творчасці. Так, у вершы "Заклятая кветка" паэт гаворыць, што ў кветку шчасця вераць мільёны людзей.

У вершы "У купальскую ноч" – гэта не толькі ведзьмы і злыдні, звязаныя з пеклам, – сам дух пушчы перашкаджае чалавеку, лічыць, што чалавек яшчэ не дарос, каб зведаць таямніцы прыроды. У вершы "На Купалле" кветка даецца ў рукі маці:

*На Купалле, на святое,*
*Рві, матуля, зелле тое,*
*Што ў нас папараць завецца!*
*І шчаслівым быць здаецца![1,с.142]*

Янка Купала не толькі шырока выкарыстоўваў купальскую сімволіку ў сваіх творах (можна назваць яшчэ і верш "Страх", паэму "Курган"), але і апісваў абрад у Вільні ў 1912 годзе, Янка Купала спадзяецца на адраджэнне абраду па ўсёй Беларусі. "Хай свята Купалы, – піша ён, – становіцца паўсямесным святам беларускага нацыянальнага адраджэння . Гэта наша шчырае жаданне ўсім жывым" *[1,с.98]*.

Блізкімі да купалаўскіх былі спадзяванні Алеся Гаруна. Узнаўляючы ў думках самае дарагое ў жыцці, самае блізкае душы (верш "Начныя думкі"), паэт не абмінае яркіх малюнкаў купальскага святкавання.

Пра драматургію купальскага абраду пісаў і Змітрок Бядуля. У вершы "Купалле" З. Бядуля часткова перасэнсоўваючы змест абраду, расказвае пра самую прыгожую дзяўчыну, якой на свята давалі імя Купалы.

У 20-я гг. наша драматургія магла б пайсці па вельмі плённым шляху выкарыстання народнай тэатральнай культуры. Пра тое сведчыць п'еса Міхася Чарота "На Купалле", адна з самых буйных пастановак маладога, нядаўна створанага Беларускага дзяржаўнага тэатра.

На жаль, беларускі тэатр не пайшоў па шляху аднаўлення старадаўніх народных традыцый, ён ужо з канца 20-ых гг. станавіўся ўсё больш дагматычным, усё больш сацыялагічным.

Новае адраджэнне цікавасці да фальклору, да абраднасці, да Купалля, адбылося толькі ў апошнія гады. Праўда, яшчэ ў 1957 г. Уладзімір Караткевіч напісаў у многім праграмны для яго верш “У тую ноч” – не толькі пра нараджэнне Янкі Купалы, а шырэй – пра нараджэнне сапраўднай беларускасці.

Матыў шукання кветкі адраджаецца нанова, бо, як пісаў Алег Лойка:

*Шчасця купальскую кветку*
*У пушчы дзяды шукалі,*
*Белая Русь шукала,*
*А знайсці – не магла.[2,с.81]*

Мы зноў выходзім на той жа круг, з якога пачыналі класікі, зноў у пошуку, у спадзяваннях на адраджэнне.

У творах Ніла Гілевіча, Уладзіміра Караткевіча, Рыгора Барадуліна, Янкі Сіпакова, Яўгеніі Янішчыц неаднаразова ўпамінаецца абрад Купалля, у якім як бы спляліся ў адно важнейшыя ў іх творчасці паняцці - прырода, гісторыя, культура Беларусі.

Купалле ўсё больш становіцца сімвалам не толькі волі, шчасця, таямніц Сусвету, але і нацыянальнага яднання. Купалле паўстае важнейшым культуралагічным паняццем.

Ніл Гілевіч заклікае моладзь:

*Раскладайце, паліце Купалля агні!*
*Не затым, каб ускрэсла мінуўшчына,*
*А каб лепей убачыць наступныя дні.*
*Да вытокаў душой дакрануўшыся ...[2,с.330]*

Я лічу, што кліч яго пачулі лепшыя, хай сабе пакуль і не ўсе. Адраджэнне ідзе, хоць, магчыма, і не так хутка як хацелася б. Напамін пра вялікую традыцыю апяваць Купалле ў беларускай літаратуры дапаможа, на маю думку, зацікавіцца самым яркім цікавым абрадам беларусаў, адрадзіць яго як народнае свята ў нашай краіне.

## ЛІТАРАТУРА

1. Купала Я. Збор твораў: Том 1. – Мінск: Маст.літ., 1987. – 36 с.
2. Панізьнік С., Свой пачэсны пасад: Кніга пра Я.Купалу. – Мінск: Маст.літ., 1999. – 334 с.
3. Купала Я. Энцыклапедычны даведнік. – Мінск: Маст.літ., 1986. – 461 с.
4. Ліцьвінка В., Песні народных свят і абрадаў. – Мінск: Беларусь, 1984. – 190 с.